

З РЭДАКЦЫЙНАЙ ПОШТЫ

Можно ли, по просьбе прихожан, отверзать Царские Врата в храме при трудных родах?

Священник А. Почопка.

Обычай отверзать Царские Врата в храме при трудных родах практикуется в Русской Православной Церкви издревле. В «Руководстве для сельских пастырей» (1885 г.) говорится: «Так как обычай отверзать Царские Врата при родах есть не более, как молитвенное обращение к Богу и в особенности к Пресвятой Божией Матери, то отказывать требованиям прихожан — значит повергать страждущую родильницу в отчаяние. Посему пастырям Церкви не следует отказывать в просьбе прихожан, ибо исполнение такого требования не подрывает христианской истины и согласно с идеей христианской веры, а неисполнение его, напротив, может сопровождаться вредными последствиями для христианской веры, может подрывать веру в помощь Божию и располагать народ к разным причудам и еретическим обыкновениям».

Священник, придя в церковь с просящими святых молитв о родильнице, и возложив на себя епитрахиль с поручами и фелонь, отверзает Царские Врата и после возгласа «Благословен Бог наш» и обычного начала (по чину молебна), поет тропарь Божией Матери «Милосердие двери отверзи нам, Благословенная Богородица», а также «Не имамы иныя помощи...» и прочие нужные тропари. Потом произносит ектению «Помилуй нас, Боже...», «Еще молимся о милости, жизни, здравии и спасении страждущей рабы Божией...» и т.д. по чину «молебна о здравии болящего».

Естественно, священник не может совершать молебное прошение о некрещенной. Если роженица не венчана, то следует ее поисповедовать и напомнить о важности святого таинства Брака, ибо частые случаи свидетельствуют о необходимости очищения совести перед рождением нового человека.

* * *

АСАБЛІВА ЎШАНАВАНЫЯ СВЯТЫ Ў САКАВІКУ

7 сакавіка, нядзеля — Свята Праваслаўя

9 сакавіка, аўторак — Першае і другое здабыццё галавы Іаана Прадцечы.

14 сакавіка, нядзеля — Свяціцеля Грыгорыя Паламы, архіепіскапа Фесаланікійскага.

21 сакавіка, нядзеля — Крыжапаклонная — іконы Божай Маці «Знаменне» Курскай (1898г.)

22 сакавіка, панядзелак— 40 мучанікаў, у Севасційскім возеры пакутаваўшых.

27 сакавіка, субота — Дабравернага вялікага князя Расціслава — Міхаіла Кіеўскага, Смаленскага, заснавальніка гарадоў Расціслаўля, Мсціслаўля, Крычава і Слаўгарада (1167 г.).

28 сакавіка, нядзеля — Прападобнага Іаана Лествічніка.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:

222160 Мінская вобласць, г.Жодзіна, вул. 50-год Кастрычніка, 14, рэдакцыя газеты

Царкоўнае слова

падпісны індэкс 63130

Старшыня рэдакцыйнага савета свяшчэннік **Алексій Шынкевіч**

Заснавальнікі: царкоўны прыход святога Архангела Міхаіла г.Жодзіна Мінскай Епархіі Беларускай Праваслаўнай царквы, грамадзяне: В.Вайнароўскі, У.Пятроўскі,У. Кур'яновіч.

Беларуская праваслаўная газета «Царкоўнае слова» №2 ; люты 1993 года.

Кошт 6 рублеў.

Выдаецца штомесячна на рускай і беларускай мовах Аб'ём 2 друк. аркуш. Тыраж 10.000.

Надрукавана ў выдавецтве «Беларускі Дом друку», 220041, Мінск, пр-кт Ф.Скарыны, 79.
Заказ №266
Нумар падпісан у друк 5 сакавіка 1993 года.

Рэдакцыя газеты пакідае за сабой права друкаваць у газеце аўтарскія матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў.

Зарэгістравана Міністэрствам Інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 120.

УТВЕРДИ, БОЖЕ, СВЯТУЮ ПРАВОСЛАВНУЮ ВЕРУ, ПРАВОСЛАВНЫХ ХРИСТИАН, ВО ВЕК ВЕКА.


Царкоўнае слова

№2

* * БЕЛАРУСКАЯ ПРАВАСЛАЎНАЯ ГАЗЕТА * 1993г.

ПОКАЯННАЯ МОЛИТВА, ЧИТАЕМАЯ В ПРАВОСЛАВНЫХ ХРАМАХ В ДНИ СМУТЫ

Господи, Боже, Вседержителю, призри на нас грешных и недостойных чад Твоих, согрешивших пред Тобою, прогневавших благость Твою, навлекших гнев Твой праведный на ны, падших во глубину греховную. Ты зриши, Господи, немощь нашу и скорбь душевную, веси растление умов и сердец наших, оскудение веры, отступление от заповедей Твоих, умножение нестроений семейных, разъединения и раздоры церковныя, Ты зриши печали и скорби наша от болезней, гладов, потопления, запаления и междоусобныя брани происходящия, но премилостивый и человеколюбивый Господи, вразуми, настави и помилуй нас, недостойных. Исправи жизнь нашу греховную, утоли раздоры и нестроения, собери расточенныя, соедини рассеянныя, подаждь мир стране нашей и благоденствие, избави ю от всяких бед и несчастий. Всесвятый Владыко, просвети разум наш светом учения Евангельского, возгрей сердца наша теплотою благодати Твоея и направи я к деланию заповедей Твоих, да прославится в нас всесвятое и преславное имя Твое Отца и Сына и Святаго Духа, ныне и присно и во веки веков. Аминь.



Сардэчна віншуем Яго Святейшаства Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Алексія II з Днём Ангела і маліоўна жадаем Божай мудрасці ў кіраванні Святой Рускай Праваслаўнай Царквой!

Многая лета!

СТРЭЧАННЕ ГАСПОДНЕ

Праз сорак дзён пасля Свайго нараджэння Хрыстос, згодна З Законам Майсеевым, быў прынесены ў Іерусалімскі храм. У той жа час і Маці Яго зрабіла абрад ачышчэння і ахвярапрынашэння. Таму і мы, праз сорак дзён пасля Ражства (2/15 лютага), святкуем у Царкве Стрэчанне (г.зн. сустрэчу) Гасподне.

Сустрэча Дзіцяці Хрыста старцам Сімеонам і прарочыцай Аннай (Лк. 2.22—26) — галоўная падзея гэтага свята. Сімеону «было прадказана Духам Святым, што ён не ўбачыць смерці, пакуль не ўбачыць Хрыста Гасподня», і, натхнёны Духам, ён прыйшоў у Храм, дзе і сустрэў нованароджанага Месію, узяў Яго на рукі і вымавіў словы, якія дагэтуль мы пяём у канцы кожнай Вячэрні:

«Ныне отпущаеши раба Твоего, Владыко, по глаголу Твоему с миром; яко видеста очи мои спасение Твое, еже еси уготовал пред лицем всех людей, свет во откровение языков (т.е. язычников), и славу людей Твоих Израиля.»

Св. Сімеон таксама прадказаў, што Ісус будзе «прадметам нараканняў» на «падзенне і паўстанне многіх у Ізраілі» і што Маці Божая будзе пакутаваць з—за свайго Сына. Прарочыца Анна прысутнічала пры гэтым і, «падыходзячы, славіла Госпада і гаварыла аб Ім усім, хто чакаў збаўлення ў Іерусаліме».

У богаслужэнні свята падкрэсліваецца, што Хрыстос, Сын і Слова Божае, Кім быў створаны ўвесь свет, — цяпер, будучы дзіцяцем, ляжыць на руках у старца; Ён, які даў Закон, — цяпер Сам яго выконвае як чалавечае дзіця.

«Приими, Симеоне, Егоже под мраком Моисей законополагающа провиде (т.е. видел) в Синаи, младенца бывша, закону повинующася: Сей есть законом глаголавый, сей есть во пророцех реченный: воплотивыйся нас ради, и спасый человека, Тому поклонимся.

Да отверзается дверь небесная днесь: безначальное бо Слово Отчее, начало приим под леты (т.е. воспринял начало во времени), не отступль Своего Божества, от девы яко младенец четыредесятодневен, Материю вольне приносится в церковь законную: и Сего на руки приемлет старец, отпусти, зовый, раба Владыко: ибо очи видеста спасение Твое. Пришедый в мир спасти род человечь, Господи, слава Тебе. (Стихиры праздничной Вечерни).»



Вячэрня і Ютрань свята багатыя песнапеннямі на гэтую ж тэму. У Боскай Літургіі радкі з песні Божай Маці ўтвараюць пракімны, а словы старца Сімеона — вершы для спеваў «Аллилуия». Евангельскія чытанні апавядаюць аб Стрэчанні, у той час як ветхазапаветныя чытанні на Вячэрні напамінаюць нам аб Законе ачышчэння з кнігі Левіта, аб бачанні Трысвятога Госпада ў Храме прарокам Ісайяй і аб дараванні веры егіпцянам, прадказанай тым жа Ісайяй, калі святло Гасподне будзе «шчырасцю язычнікаў» (Лк. 2.32).

Натхнёныя і вядзёныя Святым Духам, як і св. Сімеон Богапрыімец, веруючыя могуць таксама набываць сваё ўласнае «стрэчанне» з Госпадам і сведчыць, што і іх можа «адпусціць» Гасподзь, бо іх вочы бачылі Божае выратаванне ў Асобе Хрыста.

«Радуйся, благодатная Богородице Дево, из Тебе бо возсия Солнце правды, Христос Бог наш, просвещаяй сущыя во тьме: веселися и ты, старче праведный, приемый во объятия Свободителя душ наших, дарующаго нам воскресение. (Тропарь).»

«Утробу Девичу освятивый рождеством Твоим, и руце Симеоне благословивый, якоже подобаше, предварив и ныне спасл еси нас, Христе Боже: но умири во бранех жительство (т.е. подай мир обществу среди браней), и укрепи православныя христианы, ихже возлюбил еси, едине Человеколюбче. (Кондак).»

На Беларусі існуе звычай асвячаць свечкі на ютрані і на Боскай Літургіі. Свяшчэннік чытае пяць малітваў, праз якія мы звяртаемся да Бога з просьбай «сия свещы, яже мы раби Твои, к величию имени Твоего воспринимаем, и носити желаем, благословити и освятити, и светом небесного благоволения воспалити изволити...», а потым іх акрапляе святой вадой.

Выкарыстоўваюцца гэтыя свечкі не толькі пад час грому ці навальніц, але і калі на нас находзіць гром нябеснага пакарання, ці навала ад нячыстага, калі гора і бяда прыходзяць у нашу хаціну знянацку. Малітвай шчырай і запальваннем свечак стрэчанскіх перад святымі іконамі мы павінны духоўна граміць усё нядобрае і грахоўнае, што спакушае нас і адводзіць нас ад Збавіцеля Хрыста, святасці жыцця і Веры Праваслаўнай. Вось чаму гэтае свята вядома на Беларусі пад назвай «Грамніцы».

ФАКТЫ ДЛЯ РОЗДУМУ

ЦЕРКОВНЫЙ МАГАЗИН В МОСКВЕ

Иконная лавка «Софрино» открылась в самом центре Москвы — на углу Тверской улицы Камергерского переулка (метро «Кропоткинская»). В киоске большое разнообразие икон, церковной утвари, богослужебных одежд, а также имеются в продаже книги духовно—нравственного содержания. Есть отдел, в котором можно приобрести все необходимое для храма за валюту.

Посетив этот магазин, хочется пожелать, чтобы такие магазины были в каждом епархиальном городе Беларуси. Это и хорошо и удобно для всех.

М. ВАСИЛЕВИЧ.

* * *

БУДЕТ ПРАВОСЛАВНЫЙ ВУЗ

Игумен Иоанн (Экономцев) и диакон Андрей (Кураев) подготовили пакет документов, необходимых для регистрации первого Православного университета в г. Москве. Предполагается, что высшее учебное заведение, в котором наряду с церковными дисциплинами будут преподаваться светские предметы, откроется в Рождественском монастыре. При самом благоприятном стечении обстоятельств университет начнет работу в следующем учебном году.

* * *

Праваслаўныя беларусы Польшчы звярнуліся да ўрадавай дэлегацыі Беларусі, якая наведала Рэспубліку Польшча ў 1992 годзе, з просьбай дапамагчы аднавіць агульнабеларускую святыню — манастыр у Супраслі.

Значная дапамога будзе аказана нашай рэспублікай у аднаўленні праваслаўнага Супрасльскага Свята—Благавешчанскага манастыра ў Рэспубліцы Польшча ў гэтым годзе.

Брэсцкі камбінат будматэрыялаў паставіць, напрыклад, з гэтай мэтай 200 тысяч штук глінянай фасаднай цэглы, а Мікашэвіцкі каменеапрацоўчы завод — 500 квадратных абліцовачных гранітных пліт. Рыхтуюцца да адпраўкі керамічная чарапіца і ліставая медзь. Усе траты прадпрыемстваў на гуманітарную дапамогу фінансуюцца ўрадам.

* * *

ЗА БОГАЎГОДНЫЯ СПРАВЫ Ордэнам Святога Уладзіміра трэцяй ступені ўзнагародзіў Патрыярх Усяе Русі Алексій II старшыню калгаса «Маладая гвардыя» Драгічынскага раёна Віктара Верамейчыка. Па ініцыятыве кіраўніка гэта гаспадарка затраціла звыш аднаго мільёна рублёў на ўзвядзенне ў вёсцы Ліпнікі Храма Прасвятой Багародзіцы. Сёлета калгас выдзеліў яшчэ 400 тысяч рублёў на аплату працы мастакоў, якія займаюцца роспісам царквы.

* * *

ВЕРЫ ДВАДЦАТЬ ДОРОГ...

По сведениям, полученным корреспондентом БелаПАН в Комиссии по делам религий Верховного Совета Беларуси, в республике насчитывается 1501 религиозная община.

Из них: православных — 787, римско—католических — 305, евангельских христиан—баптистов — 141, христиан веры евангельской (пятидесятники) — 17-, адвентистов седьмого дня — 17, греко—католических — 8, новоапостольской церкви — 8, мусульман — 8, иудеев — 7, евангельских христиан правильного Евангелия — 5, старообрядческой церкви — 26, кришнаитов — 3, дээн—буддистов — 1, свободная православная церковь — 1, церковь Иисуса Христа — 1, церковь Христова — 1, кальвинистов — 1, бахаистов — 1, свидетелей Иеговы — 1, христиан веры апостольской —9.

* * *

АСТРОНОМЫ АСТРОЛОГАМ НЕ ВЕРЯТ

Более двухсот астрономов СНГ обратились к руководителям средств массовой информации с просьбой предоставить слово специалистам в тех областях, рядом с которыми, по их мнению, пышным цветом расцвели всевозможные псевдонауки.

Ученые серьезно обеспокоены повысившимся интересом к астрологии, магии, предсказаниям различного рода колдунов и уфологов.

* * *

ПРАВОСЛАВНЫЕ ЖУРНАЛЫ — ДЕТЯМ

Более всех других обделены ныне хорошими книгами дети от семи до пятнадцати лет. Группа православных священников, ученых и журналистов, объединившись при Издательском отделе Московской Патриархии, решила в меру своих сил начать заполнение этого вакуума изданием православных журналов для детей и юношества.Журнал, адресованный детям от семи до пятнадцати лет, называется «Пчелка». Желающие приобрести этот журнал могут обращаться в Издательский отдел Московской Патриархии: ул. Погодинская, 20, корп. 2. Тем, кто купит большие партии (не менее ста экз.), предоставляется торговая скидка. Звонить по телефону 245-37-85.

Журнал «Воскресная школа» предназначен для подростков 14—17 лет. Это чтение для тех, кто в поиске смысла жизни, в поиске ответов на вечные вопросы. В «Воскресной школе» можно прочитать о Библии, о современной космологии, о великих ученых и писателях христианах, о русской истории и святых отцах древности.

* * *

Фирма «Гродножилстрой» выделила недавно Гродненской епархии 100 тысяч рублей на восстановление Борисоглебской церкви, больше известной как Коложская.

Крутой неманский берег, на котором с XII века стоит Коложа, подтачивают оползневые процессы, грозящие вновь, как это уже было когда—то, обрушить часть стен уникальнейшего архитектурного памятника. Поэтому и идет сбор средств на его спасение, открыты специальные банковские счета.

РАЗМОВЫ НАКОНТ МОВЫ

Учарашнія паклоннікі атэістычнага марксізму—ленінізму ўзялі на сябе абавязак павучаць Царкву на якой мове весці набажэнствы. Таму ў пэўных сродках масавай інфармацыі можна прачытаць адозвы, звароты, клічы паўстаць на барацьбу з «маскоўскай русафальскай Праваслаўнай Царквой», пазбавіць яе мовы святых Кірылы і Мяфодзія, на якой і вядуцца на нашай зямлі тысячу год святыя багаслужбы. Што сказаць гэтым людзям? Выбач, Божа, іх невуцтва і здрадніцтва мове сваіх прадзедаў, мове Ф. Скарыны і святой Еўфрасінні Полацкай, мове святых Кірылы Тураўскага і Афанасія Брэсцкага. Ім да спадобы мова бязбожжа і хулы на святыню Божую, мова брыдот і непавагі да Веры Праваслаўнай. На такой мове яны сёння размаўляюць з Маці—Царквой і яе вернікамі. Таму мы вырашылі прапанаваць артыкул аднаго з беларусаў, які па—свойму бачыць гэтае пытанне і па—сапраўднаму непакоіцца за будучае нашай мовы на Бацькаўшчыне.

ЦАРКВА І МОВА

Зруйнавана і знішчана вялікая дзяржава. Але змрочная «закуліса» не можа канчаткова супакоіцца, пакуль існуе адзіная Праваслаўная Царква.

І таму яе, безумоўна, трэба раз'яднаць, бо інакш, гледзячы на адзіную Царкву, праваслаўныя беларусы і украінцы заўсёды будуць імкнуцца да адзінства з братамі — рускімі (уся наша гісторыя аб гэтым сведчыць).

Каб лягчэй выканаць і гэты пункт сваіх «абавязацельстваў», некаторыя «свядомыя» беларусы (шкада толькі, што свядомасць у іх вельмі адносная) спрабуюць уцягнуць Царкву ў так званую «моўную» дыскусію. І не беспаспяхова.

Пытанне першае: хто дамагаецца зараз, каб набажэнства вялося на беларускай мове замест царкоўнаславянскай? Адказ: частка беларускай моладзі, «юноши и девушки, которые буквально одержимы национальным пессимизмом» (В.В.Нефедов. Беседы с митрополитом Филаретом — Мн.: Полымя, 1992, с.23).

Можа, як сведчыць сумны вопыт, слова «одержимы» трэба разумець у літаральным, першапачатковым сэнсе? Бо нічым іншым нельга растлумачыць з'яўленне, напрыклад, на першай старонцы «ЛіМа» (17.07.92) кашчунскай выявы А. Шалімы (выпускніка Беларускай Акадэміі мастацтва!) пад назвай «Адлюстраванне». Рэдакцыйны тэкст паведамляе: гэта — адлюстраванне змен, «што адбыліся ў свядомасці людзей за апошнія некалькі год». Трэба, аднак дадаць, што адначасова гэта — адлюстраванне свядомага здзеку, пачварнага па сваёй бессаромнасці погляду на Сына Божага і Яго Маці.

Каб дагадзіць гэтай «апантанай» меншасці (хаця да ёй можна далучыць дзеячоў, гэта, усё роўна, меншасць) і робяцца досыць рызыкоўныя моўныя эксперыменты. «Церковь этому не препятствует» (В.В.Нефедов. Указ. соч., с.25). Адначасова быццам заплюшчваюць вочы на зразумелую нездаволенасць пераважнай большасці праваслаўных вернікаў, якія лічаць, што замена мовы царкоўнаславянскай на мову яшчэ не царкоўную (стваремая на ёй багаслоўская і богаслужбовая тэрміналогія патрабуе «сінхроннага перакладу» як для рускіх, так і для саміх беларусаў, і ніякая «граматыка» тут не дапаможа!) пакуль нічым не абгрунтавана.

Пытанне другое: а можа тут няма з—за чаго ўздымаць гвалт? Адказ: пачынаецца ўсё з дробязі. Вось, напрыклад, газета «Во славу Родины» (2.07.92, с.3) перадрукоўвае вышэйпамянёныя «Беседы с митрополитом Филаретом». Справа добрая і патрэбная, але пры гэтым С. Асіноўскі выкідвае са слоў мітрапаліта цэлыя абзацы. Што ж яму там не падабаецца?

«Есть люди, которые почему—то сегодня винят обязательно русских во всех своих неудачах и неустроенностях. И забывают о том, что также, как и другие народы, от всех неурядиц, которые постигли наше Отечество, не меньше, а, может, и больше страдали русские люди. Наверное, стоит вспомнить о том, как бескорыстно помогала Российская Федерация всем республикам, как после жестокой войны она служила делу восстановления разрушенных белорусских, украинских, молдавских и других городов и сел, укреплению и развитию национальной жизни, культуры и экономики народов бывшего Союза». Па меркаванню С. Асіноўскага, такія рэчы друкаваць нельга.

Яшчэ прыклад. «Говоря о белорусском языке, хочу отметить, что, наверное, стоило бы очистить его от всех наслоений, чтобы он действительно был языком народа, проникнут был бы народным духом. И еще... Бытует иногда, к сожалению, и такой подход — лишь бы не быть похожим на русский...» Зноў — вельмі слушная заўвага, але Асіноўскаму і яна — не да спадобы, аб рускіх — ні слова! Так выказванне мітрапаліта робіцца больш «гладчэйшым», аднабаковым. Не дзіўна, што ў сваёй рэцэнзіі на «Беседы...» П. Васілеўскі («ЛіМ», 17.07.92, с.10) ў першую чаргу шукае ў іх (і спрытна знаходзіць!) «расійскі вялікадзяржаўны падтэкст», іншых інтарэсаў у яго няма.Аднак «апантаную» меншасць такой «цэнзурай» і частковымі кампрамісамі не супакоіць. Іх погляды найбольш рэльефна выказваюцца ў Адкрытым лісце грамадска—палітычнага клуба «Спадчына» да Шушкевіча і Кебіча (Наша слова», 8.07.92, с.2). «Шаноўныя спадары», на чале з А. Белым рэзка абвінавачваюць Праваслаўную Царкву ў падмане і русіфікатарстве. У сваіх развагах яны дакучліва ўжываюць зняважлівую мянушку «поп», «папы» (якая гучыць у іх як адмысловая лаянка).

Дык вось, гэныя «папы» пад узначальваннем Патрыярха Маскоўскага змогуць толькі «імітаваць справу беларусізацыі, а на практыцы праводзіць русіфікацыю», ніколі «не зробяць прыхаджан беларусамі»(!).

Так і хочацца адказаць: «Панове дабрадзею, рабіцца беларусам, ці можа яшчэ кім—небудзь, гэта цалкам асабістая справа кожнага верніка. У Царквы зусім іншыя мэты. І калі вы, паночкі мае, нічога не ведаеце пра гэтыя мэты, то аніякага дачынення да Царквы не майце, і не вам, атэістам, рабіць ёй бестактоўныя рэкамендацыі. Толькі сама Царква можа разабрацца ў такой далікатнай справе як мова...

Папы ж, шаноўныя вы мае, больш клапоцяцццца аб духоўным адраджэнні свайго народа, клапоцяцца пра абедні, хрэсьбіны, шлюбы і іншыя, перш за ўсё, патрэбныя народу справы (на «русіфікацыю» часу не хапае!), а вось «справай беларусізацыі» няхай займаюцца тыя, хто знішчаў нашу мову, аб чым сведчаць іх словы і дзеянні, хто за гэта зараз атрымлівае грошы (не будзем ужо ўдакладняць, чые грошы, бо падаткі плацяць жыхары Беларусі ўсіх нацыянальнасцей...).

Адным словам, не дурыце людзям галовы, і калі хочаце быць беларусамі, то сапраўды будзьце імі, толькі, крый Божа, нікога не прымушайце! На Беларусі ж жывуць не толькі беларусы, але і шмат каго яшчэ.

Аднак трэба падвесці вынікі. «Апантаную» і вельмі агрэсіўную меншасць не задаволяць ніякія моўныя кампрамісы пакуль, па іх думцы, Праваслаўная Царква канчаткова не ператворыцца ў нейкую фабрыку па вырабу «свядомых» беларусаў. Тое, што пасля гэтага яна перастане быць Царквой, іх не турбуе...

Паўлюк БЕЛАРУС

Председателю Верховного Совета РБ С.С. Шушкевичу
Генеральному Прокурору РБ В.И.Шолодонову

ТРЕБУЕМ ПОЛОЖИТЬ КОНЕЦ ОСКОРБЛЕНИЯМ ПРАВОСЛАВНОЙ ЦЕРКВИ

(Открытое письмо Православного Братства во имя Архистратига Божия Михаила при Минской епархии)

Члены Братства от лица многотысячной православной общественности выражают острую озабоченность той недопустимой ситутацией, которая сложилась теперь в некоторых периодических изданиях.

В течение длительного времени со страниц этой прессы малым, но крикливым униатским меньшиством, в явно политических целях ведется кампания компрометации Православной Церкви и ее служителей. Несомненным «лидером» здесь является газета «Літаратура і мастацтва».

В номере от 4.09.92 г. подвергся оскорблениям Митрополит Минский и Слуцкий, Патриарший Экзарх всея Беларуси Филарет, которого газета практически приравняла к агенту иностранной державы.

После известного разбойного нападения на священника о. Алексия Шинкевича эта же газета в номере от 25.09.92 г. прокомментировала происшествие в совершенно издевательском духе. Список подобных публикаций в «ЛіМе»е и других белорусскоязычных газетах можно было бы продолжить и дальше.

Однако последней каплей, переполнившей чашу нашего терпения, стала клеветническая статья народного депутата З.С. Пазняка в газете «Звязда» от 20.01.93 г., которая носит явно провокационный характер в отношении православных Беларуси. В ней есть все: и оскорбительные намеки на связь Православной Церкви с «партократами» и КГБ, и угрозы обрить бороды, и обвинения православных в крови «невинно убитых» униатов. Для профессионального историка сие является непозволительной ложью.

Таким образом, мы имеем дело с многочисленными случаями грубейшего оскорбления религиозных чувств православных верующих и вопиющего нагнетания религиозной нетерпимости.

В связи с вышеизложенным мы выражаем свою озабоченность и просим:

1. Рассмотреть вопрос о прекращении государственных дотаций газетам и журналам, причастным к антиправославной пропаганде. Являясь исправными налогоплательщиками, православные верующие не считают возможным оплачивать клевету в свой адрес.

2. Провести Прокуратурой РБ проверку фактов, изложенных в нашем письме, и, в случае подтверждения их, принять соответствующие законные меры, которые ограждали бы религиозные чувства верующих.

Принято на общем собрании Братства 28.01.93 г.

Председатель Совета Братства О.В. Дихтиевский.

Вышеприведенное письмо поддержано Православными Братствами св. великомученика Георгия Победоносца (Минск); св. равноап. Мефодия и Кирилла, учителей словенских (Минск) и св. Архистратига Михаила (Жодино).

АБ ХРЫСЦІЯНСКІМ НАЦЫЯНАЛІЗМЕ

(Урывак з кнігі «Асновы хрысціянскай культуры»)

У гэтым артыкуле вядомага праваслаўнага філасофа І. Ільіна даецца хрысціянскі погляд на адну з хвалюючых у наш час з'яў — нацыяналізм. Праваслаўная Царква на Беларусі нічога агульнага не мае з тым антыхрысціянскім нацыяналізмам, які абвясцілі некаторыя сённяшнія прыхільнікі беларускага нацыянальнага адраджэння. Хрысціянскі нацыяналізм — гэта адданая любоў да Бога і нашая ў Бозе любоў да сваёй Айчыны і свайго народа. Тут няма нянавісці да іншых народаў і нацый, бо гэта справа д'ябла — ненавідзець людзей за іх мову і іх звычаі. Спадзяёмся, што гэты артыкул паставіць усе кропкі над «і» для тых чытачоў, якія асабліва непакояцца аб духоўна—нацыянальным адраджэнні Беларусі.

Культура ствараецца не адным чалавекам. Яна з´яўляецца здабыткам многіх людзей, духоўна з´яднаных паміж сабою. Кожныя два сябры ўтвараюць у сваіх адносінах пэўны культурны ўзровень і ствараюць пэўны культурны змест. Гэта адбываецца і ў кожнай сям´і, у кожным грамадстве, у кожнай арганізацыі і ў кожнага народа. Людзі не выпадкова яднаюцца адно з адным: іх прыцягвае адно да аднаго падабенства матэрыяльных і духоўных інтарэсаў; з гэтага падабенства ўзнікаюць зносіны; працяглыя зносіны павялічваюць узаемнае падабенства і, калі зносіны маюць творчы характар, то ўзрастае і ўзаемнае прыцягненне, узмацняецца ўзаемная сувязь. Гэтая сувязь замацоўваецца традыцыяй, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне. Так паступова ўзнікае адзіная і агульная для ўсіх культура.

Самае глыбокае яднанне людзей узнікае з іх духоўнага падабенства, з аднолькавага душэўна—духоўнага ўкладу, з аднолькавай любові да адзінага і агульнага, з агульнага лёсу, што звязвае людзей у жыцці і смерці, з аднолькавага светасузірання, з агульнай мовы, з адзінай веры і з супольнай малітвы. Менавіта такою з´яўляецца нацыянальная еднасць людзей.

Нацыянальнае пачуццё не толькі не пярэчыць хрысціянству, але набывае ад яго свой найвышэйшы сэнс і аснаванне: бо яно стварае яднанне людзей па духу і любові, і прымацоўвае сэрцы да найвышэйшага ў свеце — да дароў Святога Духа, якія даюцца кожнаму народу і пераўтвараюцца кожным народам па—свойму ў гісторыі і культурнай творчасці. Вось чаму хрысціянскую культуру і нацыяналізм трэба не асуджаць, а ўспрымаць радасна і творча.

* * *

Кожны народ мае ІНСТЫНКТ, дадзены яму ад прыроды (а гэта значыць — і ад Бога), і дары Духа, атрыманыя ад Творцы ўсіх. У кожнага народа інстынкт і дух жывуць па—свойму і ствараюць каштоўную своеасаблівасць. Напрыклад, кожны народ па—свойму бярэ шлюб, нараджае, хварэе і памірае; па—свойму лянуецца, працуе, гаспадарыць і адпачывае; па—свойму бядуе, плача і смуткуе; па—свойму ўсміхаецца, смяецца і радуецца; па—свойму ходзіць і танцуе; па—свойму спявае і стварае музыку; па—свойму гаворыць, дэкламуе, жартуе і прамаўляе; па—свойму назірае, сузірае і стварае жывапіс; па—свойму даследуе, спазнае, мяркуе і даказвае; па—свойму жабрачыць, дабрачынствуе і гасцінны; па—свойму будуе дамы і храмы; па—свойму моліцца і геройствуе; па—свойму змагаецца... Па—свойму арганізоўваецца. У кожнага народа адметнае, сваё пачуццё права і справядлівасці; адметны характар, адметная дысцыпліна; адметнае ўяўленне пра маральны ідэал; адметная палітычная мара; адметны дзяржаўны інстынкт. Адным словам: у кожнага народа адметны, асаблівы душэўны ўклад і духоўна—творчы акт. У кожнага народа АСАБЛІВАЯ, НАЦЫЯНАЛЬНА—ЗАРОДЖАНАЯ, НАЦЫЯНАЛЬНА — ВЫНАШАНАЯ І НАЦЫЯНАЛЬНА—ВЫПАКУТАВАНАЯ КУЛЬТУРА.

* * *

(працяг у наступным нумары)

МІЛАСЭРНАСЦЬ — СПРАВА БОСКАЯ

Напэўна, нікога б не здзівіла гэтая вайсковая палатка, калі б не месца яе знаходжання. Менавіта там, каля аўтамабільнай магістралі на невялікім узвышшы быў асвечаны першы камень у падмурках храма Ушанавання іконы Божае Маці «Усіх тужлівых радасць» у памяць ахвяраў Чарнобыля. Раней такія палаткі, шатры ўжываліся для набажэнстваў у паходах вайскоўцаў, перад вялікімі і малымі бітвамі... Палатку абсталёўвалі як паходную царкву.

Дык вось, гэтая традыцыя знайшла свой працяг і ў мірны час, дала выйсце з таго стану, у якім апынуліся прыхаджане Фрунзенскага раёна Праваслаўнай Царквы. Так што арыенцір для вернікаў з´явіўся: тут чакаюць праваслаўныя святары на набажэнствы, тут гучаць малітвы за здароўе пацярпеўшых ад чарнобыльскай аварыі. Ну, а пра шляхі храма сёння распавядае с карэспандэнтам «Вяснянкі» святар айцец Ігар Карастылёў.

— Гэта выйсце, канешне, часовае. Яго мы ўзялі з гісторыі царквы, калі святары разам з войскамі ішлі ў паходы. Напэўна, вам будзе цікава ведаць, што ў царкве Аляксандра Неўскага захоўваецца сень тагачаснай вайсковай паходнай царквы.

— Калі ж пачала працаваць часовая царква?

— Са жніўня мінулага года, пасля таго, як камандзір адной з беларускіх вайсковых часцей падараваў нам гэтую вялікую палатку і салдаты дапамагалі яе ўстанавіць. А за намі засталася не менш складаная праца па абсталяванню, па прывядзенню яе ў адпаведны выгляд. Слава Богу, нашыя вернікі ўжо яе ўспрымаюць: адносяцца да гэтай часовай царквы, як мае быць і адчуваюць у ёй тое, што мы звыкла называем «благодатью Божьей». Тут вядуцца пастаянныя службы, зроблена поўнае ўбранства царквы, устаноўлены крыжы і людзі бачаць здалёк нашую царкву.

— Які ж расклад работы вашай царквы?

— Мы служым Боскую Літургію кожную суботу і кожную нядзелю ў 9 гадзін. Акрамя таго, мы адзначаем усе вялікія святы Праваслаўнай Царквы.

Па суботах адбываюцца заняткі, на якіх вывучаецца праваслаўны катэхізіс для дарослых.

Гэта дапамагае слухачам глыбей разумець, што такое Праваслаўная Вера, як праводзяцца абрады ў Царкве, як наша Царква адносіцца да іншых веравызнанняў,карацей, пра ўсе працэсы, якія адбываюцца ў Праваслаўнай Царкве.

Як бы не было, мы павінны добра ведаць веру сваіх продкаў, берагчы яе традыцыі.

А калі ў нас з´явіцца свой пастаянны хор, будуць служыцца і начныя службы. Як мае быць, з суботы на нядзелю. А пакуль, як я казаў, у суботу, нядзелю і ўсе святы запрашаем да нас.

— Як бачым і сёння, у сераду працуе царква. Напэўна, не выпадкова?

— У нашай царкве, як і звычайна, праводзіцца хрышчэнне і вянчанне. Праводзяць нашыя службы два святары — я — айцец Ігар і айцец Сергій Кузьмянкоў. Мы ў царкве па серадах з 12 гадзін праводзім таінства Хрышчэння і Вянчанне. Гэтыя таінствы мы праводзім і па нядзелях у 12 гадзін.

— Напэўна, трэба загадзя ўзгадніць сваё жаданне?

— Гэта адбываецца і па ўзгадненню са святарамі, па запісу ў спецыяльнай кнізе, якая знаходзіцца ў тых людзей, якія ахоўваюць царкву. А таксама тут можна зрабіць запісы і на іншыя трэбы, напрыклад, асвяшчэнне і закладку дома, кватэры альбо на пахаванне. Мы выязджаем да людзей з мэтай правядзення абрадаў. Але ездзіць па розных адрасах вельмі складана: раён вельмі вялікі, жыхароў амаль 330 тысяч чалавек.

— Зараз пытанне, якое цікавіць шмат людзей: як ідзе збор сродкаў на пабудову храма — помніка?

— Вернікі вельмі актыўна вядуць збор сродкаў. Але ж зараз кошт будаўнічых матэрыялаў і паслуг падняўся да неверагодных вышынь. І ўсяго таго, што было сабрана на пабудову, цяпер недастаткова. Зараз усім цяжка: і людзям, і прадпрыемствам. Таму з вялікімі цяжкасцямі і марудна ідзе збор сродкаў.

Трэба адзначыць, што найбольш актыўна адгукнуліся на наш заклік тыя людзі і тыя арганізацыі, якім самім патрэбна дапамога. Гэта, у першую чаргу, таварыства інвалідаў. Яно нам дорыць на збудаванне хрысцільні шмат дэфіцытных будаўнічых матэрыялаў. Сам храм вялікі і будзе будавацца не адзін год. А хрысцільня — невялікая пабудова, якая, я мяркую, будзе ўзведзена хутка.

З завода металаканструкцый даюць неабходныя металічныя канструкцыі. Фонд Г. Грушавога «Дзецям Чарнобыля», з якім у нас усталяваліся добрыя адносіны, таксама вельмі дапамагае нам...

— Але ж асноўныя сродкі для пабудовы — гэта грошы простых людзей?

— Так і павінна быць. Вы ж бачылі, колькі прыходзіць да нас і пажылых людзей, і маладых. І ім патрэбна духоўная падтрымка ў нашым складаным свеце. Сюды прыходзяць і сляпыя, і прыязджаюць нерухомыя на інвалідных калясках. У нас вялікая радасць: германскія сябры падаравалі мікрааўтобус, на якім можна будзе прывозіць сляпых вернікаў на набажэнствы. Гэта можа быць і адзін, і два, і тры рэйсы, карацей, колькі спатрэбіцца. Тое ж самае і для іншых інвалідаў.

Асабліва вялікі інтарэс да нашай царквы выказвае таварыства сляпых. Справа ў тым, што ў Менску да пачатку 30—х гадоў дзейнічаў храм ушанавання іконы Божай Маці «Усіх тужлівых радасць». І наша царква з´яўляецца прыемніцай царквы, якая існавала пры вучэльні сляпцоў.

Скажу больш, у нас ёсць свая група міласэрнасці з прыхаджан для дапамогі інвалідам. Акрамя таго, з вялікай радасцю жадаю вам паведаміць, што нядзельная школа ў нашым раёне — адна з самых вялікіх у горадзе. Тут навучаецца больш за 200 чалавек. Дзеці з гэтай школы таксама аказваюць вялікую дапамогу інвалідам.

У нашых планах адкрыццё нядзельнай школы і для глуханямых. Такі ўжо склаўся пагалосак пра нашу царкву. І я думаю, што гэта нядрэнна, бо гэта справа Божая — дапамагаць чалавеку міласэрнасцю ў дзеянні.



(ПРОДОЛЖЕНИЕ. НАЧАЛО В НОМЕРЕ 1)

ТАИНСТВО КРЕЩЕНИЯ

ПОСЛЕДОВАНИЕ ЧИНА ОГЛАШЕНИЯ

Молитва во еже сотворити оглашеннаго

В ранней христианской Церкви взрослого человека, пожелавшего принять Крещение, приводили к местному епископу его будущие восприемники (поручители). Это были члены христианской общины, которые свидетельствовали о серьезности намерений его и искренности обращения. Получив такие заверения, епископ вносил его имя в списки катехуменов (оглашенных). После наставления в вере оглашенный в знак покорности и смирения развязывал пояс, совлекал верхние одежды, отрешаясь от мирской гордости и тщеславия, и босыми ногами становился на разостланную власяницу. Опущенные вниз руки знаменуют избавление от рабства отцу лжи. Взор, устремленный на восток, означает ожидание отверстых дверей рая, откуда были изгнаны после грехопадения Адам и Ева, ибо «насадил Господь рай в Едеме на востоке...» (Быт. 2, 8). Иерей трижды дует крестообразно на лицо оглашаемого, напоминая этим, что «создал Господь Бог человека из праха земного, и вдунул в лице его дыхание жизни, и стал человек душею живою» (Быт. 2, 7).

Человек приходит ко Христу, чтобы спастись, и первое священнодействие крещального обряда — это возложение руки, жест защиты и благословения. Рука священнослужителя — рука Самого Господа Иисуса Христа — защищает, дает прибежище, «возмет под крыло», ибо в будущем этому человеку предстоит смертельная схватка с силами тьмы.

Взрослому человеку при Крещении необходимо предварительно испытать свою веру и серьезность принятого им решения. Следует себе уяснить, не из суеверных ли соображений решил он прибегнуть к святому таинству Крещения и понимает ли он смысл его. Если человек тянется к Богу, но не имеет достаточного представления о христианстве, Церкви и ее таинствах, то ему необходимо встретиться с приходским священником, который кратко преподаст этому человеку основные истины Православия. Лучше отложить совершение Крещения на некоторый срок, чтобы изучить и сознательно произносить (лучше наизусть) Символ веры, молитву Господню и«Богородице Дево, радуйся...» Надо уметь правильно слагать персты и осенять себя крестным знамением. Нужно приобрести необходимые каждому христианину экземпляры Православного молитвослова, Псалтири, Нового Завета, изданные Московской Патриархией. В крайнем случае можно записать текст Символа веры и основных молитв. Взрослый сознательный человек может приготовить себя к принятию таинства Крещения добровольным постом с полным отказом от вредных привычек. Чтобы иметь возможность в день Крещения причаститься Святых Таин, ему нужно прийти в храм натощак.

Три запрещения на нечистых духов

Чинопоследование оглашения включает в себя обряд запрещения и изгнания нечистых духов (экзорцизм), следующий непосредственно за первой молитвой. У Церкви всегда был опыт, подтверждающий наличие активных демонических сил, по которому зло — это не только отсутствие добра, а и присутствие вполне реального носителя зла — злой личности — демона, хотя его присутствие может быть не всегда ясным и осознаваемым.

